# БЕНЬ РАМУАЛЬД УЛАДЗІСЛАВАВІЧ



Нарадзіўся 08.02.1960 г. ў в. Пажыжма Воранаўскага сельсавета. Скончыў Ваўкавыскае педагагічнае вучылішча (1979), Гродзенскі універсітэт (1988). Працаваў настаўнікам гісторыі Даўгяльскай базавай школы (з 1982), Канвелішскай сярэдняй школы (з 1985).

Цікавіцца пытаннямі фарміравання беларускай дзяржаўнасці, гісторыяй Вялікай Айчыннай вайны, навейшай гісторыяй беларускага народа, пытаннямі краязнаўства і генеалогіі. Вывучае таксама пытанні беларуска-польскага і беларуска-літоўскага супрацоўніцтва, пачынаючы з 18 стагоддзя. Прымаў удзел у зборы матэрыялу для школьнага краязнаўчага музея, раённай Кнігі Памяці, збіраў звесткі аб ветэранах-земляках, удзельніках Вялікай Айчыннай вайны.

**Бібліяграфія:**

1. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Воранаўскага раёна / рэд. кал.: Г. П. Пашкоў (гал.рэд.) і інш.; мастак Э. Э. Жакевіч. – Мінск: БелЭн., 2004. – С. 442—443.